УДК 069 (476)

# МУЗЕІ ПРЫ ГУБЕРНСКІХ СТАТЫСТЫЧНЫХ КАМІТЭТАХ У БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

***І.В. ГРАБЯНЧУК***
*Бабруйскі філіял Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта,*
*г.Бабруйск, Рэспубліка Беларусь*

## УВОДЗІНЫ

Музеі адыгрываюць выключна важную ролю ў захаванні гістарычнай спадчыны народаў і патрыятычнага выхавання маладых пакаленняў. На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. агульнадаступныя для шырокай публікі музеі займалі трывалае месца ў еўрапейскім культурным кантэксце.

Першы публічны музей у Беларусі і Літве – Віленскі музей старажытнасцяў, які дзейнічаў у 1856 – 1865 гг. і быў зачынены па палітычных матывах пасля падаўлення паўстання 1863 г. Далейшая праца ў галіне музейнага будаўніцтва ў нашай краіне была звязана са стварэннем музеяў пры губернскіх статыстычных камітэтах, якія падпарадкоўваліся агульнаімперскаму Цэнтральнаму статыстычнаму камітэту. Арганізатары гэтых музеяў планавалі паказаць у іх экспазіцыях розныя аспекты жыцця сваіх губерняў. Па сутнасці, гэтыя ўстановы сталі прататыпамі сучасных гісторыка-краязнаўчых музеяў.

Гісторыя музеяў у Беларусі была аб’ектам увагі шэрагу даследчыкаў: М.І. Каспяровіча [1], Б.Р. Брэжга [2], В.К. Бандарчыка [3], Г.А. Каханоўскага [4], Л.В. Аляксеева [5], А.А. Гужалоўскага [6]. Аўтар карыстаўся іх напрацоўкамі для раскрыцця тэмы дадзенага артыкула. Галоўная яго задача – вызначыць тэндэнцыі развіцця музеяў пры губернскіх статыстычных камітэтах і прычыны, якія перашкодзілі ім стаць паўнавартаснымі публічнымі музеямі.

Асноўная крыніцавая база даследавання – матэрыялы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва, Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Гродне, Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. У друкаваных крыніцах звесткі пра вывучаемыя музеі ўтрымліваюцца ў штогадовых справаздачах, памятных кніжках і аглядах беларускіх губерняў, якія выдавалі губернскія статыстычныя камітэты. Захаваліся нешматлікія апісанні музеяў, складзеныя іх арганізатарамі, а ў асобных выпадках і наведвальнікамі. Крыніцы ў перыёдыцы, на жаль, захаваліся ў фрагментарным выглядзе, яны падаюць даволі мала інфармацыі адносна прадмету нашага даследавання, але яны вельмі патрэбныя для поўнай гістарычнай рэканструкцыі падзей, звязаных са стварэннем музеяў пры губернскіх статыстычных камітэтах.

## ВЫНІКІ І ІХ АБМЕРКАВАННЕ

У гісторыі ўзнікнення і станаўлення першых агульнадаступных для публікі музеяў адметную ролю адыгралі музеі пры губернскіх статыстычных камітэтах. Іх супрацоўнікамі былі чыноўнікі з мясцовых органаў улады, прадстаўнікі свецкай і духоўнай інтэлігенцыі, для якіх цікавай была навуковая праца. Аднак асноўную работу выконвалі сакратары камітэтаў, якія займалі адзіную штатную аплочваемую пасаду. Беларускі гісторык музейнай справы А. А. Гужалоўскі падкрэслівае, што менавіта яны адыгрывалі выключна важную ролю ў вызначэнні характару дзейнасці як статыстычных камітэтаў у цэлым, так і музеяў пры іх у прыватнасці [6, с. 85].

У Беларусі першы музей з разглядаемай групы ўзнік у Магілёве. Рашэнне аб яго заснаванні было прынята на пасяджэнні губернскага статыстычнага камітэта 15 лістапада 1867 г. [7, арк. 114]. Аднак яно было яшчэ даволі нявыразным: «…Дзеля вывучэння сельскагаспадарчай, рамесніцкай і фабрычнай дзейнасці насельніцтва губерні і азнаямлення спажыўцоў з прадметамі мясцовай вытворчасці, звярнуцца да прадвадзіцеляў дваранства, землеўласнікаў, паліцыі і міравых устаноў з просьбай даслаць у камітэт свае меркаванні… з тым, каб у выпадку, калі думка гэта будзе спачувальна сустрэта вытворцамі, пры камітэце створаны быў музей» [8, с. 210]. Такім чынам, у рэальнасці 15 лістапада 1867 г. была выказана толькі ідэя стварыць музей, але паколькі ў далей-

ПолесГУ

шым яна была рэалізавана, то на гэтай падставе даследчыкі ад названай даты адлічваюць гісторыю музея пры Магілёўскім статыстычным камітэце.

Ён спачатку меў чатыры аддзелы: 1) вырабаў сельскай гаспадаркі, 2) вырабаў «сельскай прамысловасці», 3) рамесніцкіх вырабаў, 4) вырабаў фабрык і заводаў. Затым, у снежні 1868 г. былі адкрыты яшчэ тры: выкапнёвых багаццяў, заалагічны, гістарычны [9, с. 255-257; 6, арк. 5]. Сучасны даследчык У. Герасімовіч узгадвае таксама пра геаграфічны аддзел Магілёўскага музея, у якім экспанавалася шмат этнаграфічных рэчаў – прадметы народных рамёстваў і промыслаў, якія былі сабраны ў Рагачоўскім, Магілёўскім, Горацкім, Быхаўскім, Чавускім і Клімавіцкім паветах [11, с. 100-108].

Важным этапам у развіцці музея пры Магілёўскім губернскім статыстычным камітэце стала праца яго супрацоўнікаў па збору экспанатаў на тэрыторыі губерні для Антрапалагічнай выставы, якая праводзілася ў Маскве ў 1879 г. Паколькі ўсе прадметы збіраліся ў некалькіх асобніках, гэта дазволіла істотна папоўніць музей [12, с. 23; 13, с. 8].

На працягу наступнага дзесяцігоддзя музей пры губернскім статыстычным камітэце зрабіўся «строга сістэматызаванай установай, якая мае ў пэўнай ступені навуковы і асабліва мясцовы інтарэс» [13, с. 10]. Відавочна, што з цягам часу змянялася структура музея. У пачатку 90-х гг. ХІХ ст. тут меўся сумесны этнаграфічны і сельскагаспадарчы аддзел, у якім дзейнічала пастаянная выстава «для азнаямлення насельніцтва з прамысловай і сельскагаспадарчай дзейнасцю губерні». Таксама на 1893 г. у музеі быў сфарміраваны гістарычны аддзел з нумізматычным аддзяленнем [10, с. 440-441].

Магілёўскі губернатар А. С. Дамбавецкі асаблівае значэнне надаваў гістарычнаму аддзелу. У час сваіх паездак па губерні ён асабіста звяртаўся да мясцовых калекцыянераў з просьбай дасылаць у музей цікавыя прадметы даўніны. Яго заклік знайшоў падтрымку. Напрыклад, на працягу 80-х гадоў ХІХ ст. у музей паступіла 14 скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі розных паветаў Магілёўскай губерні. Таксама гістарычны аддзел папоўніўся старажытнымі актамі, мясцовымі старадрукамі, рукапісамі і інш. [9, с. 256; 13, с. 23].

Трэба адзначыць, што ў збіральніцкай працы супрацоўнікаў статыстычнага камітэта існавала шмат праблем. Найбольш цяжка было сабраць узоры вырабаў мясцовых вытворцаў, бо апошнія з недаверам адносіліся да гэтай справы, разглядаючы яе як чарговую фіскальную акцыю ўладаў. Таму супрацоўнікі статыстычнага камітэта цярпліва тлумачылі людзям, што збор матэрыялаў для музея наадварот будзе садзейнічаць больш шырокаму распаўсюджанню звестак аб вытворчасці, павышэнню попыту на тавары і больш лёгкаму іх збыту [13, с. 45].

Кіраўніцтва Магілёўскага статыстычнага камітэта звярталася за садзеяннем у справе арганізацыі музея да дзяржаўных чыноўнікаў, мясцовых памешчыкаў. Для патэнцыйных ахвяравальнікаў рассылаліся апісанні першых музейных аддзелаў і цыркуляры з рэкамендацыямі па збору матэрыялаў. Сабраныя прадметы неабходна было дастаўляць павятовым спраўнікам ці ў бліжэйшыя станавыя кватэры, адкуль яны перасылаліся ў губернскі статыстычны камітэт. Першыя ўзоры глеб, раслін, хлеба, разнастайных рамесных вырабаў паступалі ў музей ад розных асоб. Сярод іх узгадваюцца супрацоўнік Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта Лідаў, памешчык Сердзюкоў, святар Катырла, чэрыкаўскі прадвадзіцель дваранства фон Бенкендорф і іншыя [10, арк. 5-10].

У сувязі з падрыхтоўкай ІХ Археалагічнага з'езда ў Вільні, які адбыўся ў 1893 г., на тэрыторыі 5 паветаў Магілёўскай губерні былі праведзены археалагічныя раскопкі. Яны ўзбагацілі Магілёўскі музей цікавай калекцыяй археалагічных прадметаў. Таксама з падрыхтоўкай да гэтага з'езда было звязана вывучэнне мясцовай царкоўнай даўніны. Магілёўскія краязнаўцы склалі планы старадаўніх, арыгінальных па сваёй архітэктуры цэркваў, сфатаграфавалі найбольш цікавыя фрэскі ў цэрквах і касцёлах. Сабраныя матэрыялы былі прадстаўлены ў музейных экспазіцыях.

У 1898 г. губернскі статыстычны камітэт выдаткаваў сродкі на рэарганізацыю музея ў памеры 128 руб. 85 кап. [15, с. 2]. Дзякуючы клопатам дырэктара магілёўскай гімназіі М. В. Фурсава, і загадчыка музея па сумяшчальніцтву, была ўдакладнена структура музейных аддзелаў, праведзена каталагізацыя, пашыраны экспазіцыйныя плошчы, што дало магчымасць павялічыць колькасць наведвальнікаў. Звычайна за адзін дзень сюды прыходзіла ад 70 да 100 чалавек [16, с. 343-344; 15, с. 2]. На жаль, такая актыўная праца ў музеі пры Магілёўскім губернскім статыстычным камітэце працягвалася нядоўга, і праз некалькі гадоў ён прыйшоў у заняпад. Можна назваць дзве асноўныя прычыны, якія вызначылі такі сумны лёс Магілёўскага музея. Па-першае, гэта звальненне М. В. Фурсава [6, с. 86]. Адпаведнай замены гэтаму энергічнаму працаўніку не знайшлося. Па-другое, не быў выпрацаваны статут музея, хоць вырашэнне дадзенай задачы планавалася



ПолесГУ

кіраўніцтвам статыстычнага камітэта ў 1898 г. [17, с. 97]. Адпаведна, не былі вызначаны сталыя крыніцы яго фінансавання. Гэта паслужыла прычынай хуткага псавання сабраных экспанатаў [18, с. 82]. У 1911 г. кіраўніцтва музея нават не мела сродкаў купіць дроў і наняць прыслугу [19, с. 86]. Таму не дзіўна, што ў гэтых умовах яно ставіла пытанне аб перадачы музея ад губернскага статыстычнага камітэта іншай установе.

Музей пры Віцебскім губернскім статыстычным камітэце ўзнік у 1868 г. Ініцыятарам яго стварэння выступіў старшыня камітэта, віцебскі губернатар У.М. Токараў. Асновай для новага музея стаў скарб, знойдзены ў 1867 г. у Лепельскім павеце, які складаўся з 225 еўрапейскіх манет. Сакратар Віцебскага статыстычнага камітэта, этнограф і археолаг А.М. Семянтоўскі (1821 – 1893) ахвяраваў музею 25 старадаўніх сярэбраных манет, у тым ліку 10 куфічных [20, арк. 22].

У музей па патрабаванні губернскай адміністрацыі паступалі розныя рэдкасці, якія адшукваліся на тэрыторыі Віцебскай губерні. Туды таксама былі перададзены дублеты з калекцый, якія сабралі сябры Віцебскай археалагічнай камісіі пры раскопках мясцовых курганоў. Асобныя экспанаты паступілі са збораў калекцыянера-аматара К. Бергнера і археолага М.Ф. Кусцінскага [21, с. 207].

Супрацоўнікі Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта распаўсюджвалі апытальныя лісты і збіралі паведамленні пра гарадзішчы, курганы і могільнікі. Цесныя сувязі падтрымліваліся з Пецярбургскай археалагічнай камісіяй, якая кіравала раскопкамі на ўсіх казённых землях, а таксама Маскоўскім археалагічным таварыствам. Гэтыя расійскія навуковыя ўстановы часта дапамагалі сябрам Віцебскага статыстычнага камітэта кансультацыямі [22, с. 55].

Трэба адзначыць, што Віцебскі губернскі статыстычны камітэт меў абмежаваныя магчымасці, каб утрымліваць і развіваць заснаваны музей. Агульнае ўяўленне аб тым, якім ён мог стаць падае праект, распрацаваны былым настаўнікам Полацкай народнай школы І. Цібрыным. У снежні 1870 г. полацкі інтэлігент прапанаваў пашырыць музей пры Віцебскім губернскім статыстычным камітэце і падзяліць яго на два аддзелы – агульны і мясцовы.

У агульным, на думку аўтара праекта, патрэбна было памясціць прадметы, якія адносіліся да ўсёй Расіі, стварыць у ім аддзяленні палеанталагічнае, мінералагічнае, нумізматычнае, археалагічнае, заалагічнае і літаратурнае (для старажытных рукапісаў і кніг). Мясцовы аддзел павінен быў аб’ядноўваць прадметы, якія датычыліся адной губерні. У ім паўтараліся таксама аддзяленні археалагічнае, заалагічнае і кніжнае. Акрамя таго, тут яшчэ планавалася стварыць прамысловае аддзяленне, «у якім знаходзяцца вырабы: стальныя, медныя, гліняныя, драўляныя, каркавыя і да т. п.». Гэта аддзяленне прапаноўвалася падзяліць на некалькі класаў – адпаведна колькасці паветаў губерні. Нарэшце, у мясцовым аддзеле неабходна было адкрыць этнаграфічнае аддзяленне.

Для ажыццяўлення свайго праекта аўтар надаваў вялікае значэнне «гарачаму спачуванню да гэтай справы ўплывовых асоб». Далей, на яго думку, Віцебскі губернскі статыстычны камітэт павінен быў найперш давесці да шырокай грамадскасці інфармацыю аб стварэнні музея і яго карысці. Каб зрабіць працу з насельніцтвам больш эфектыўнай, Цібрын прапаноўваў арганізаваць выпуск краязнаўчых зборнікаў [19, арк. 5-6; 2, с. 10]. На практыцы гэты праект застаўся нерэалізаваным з-за недахопу кваліфікаваных спецыялістаў і матэрыяльных сродкаў.

Можна пагадзіцца з думкай гісторыка Б. Брэжгі, што «да 1889 г. пад назвай «музей» існаваў пры камітэце толькі невялікі збор прадметаў нумізматычных і археалагічных, а таксама прадметаў сельскагаспадарчых і ўзораў народных строяў, якія выпадкова там апынуліся і, нарэшце, рамесных вырабаў і хатняга начыння мясцовых жыхароў» [2, с. 10].

Захаванасць сабраных прадметаў у гэтым музеі пакідала жадаць лепшага. Напрыклад, у перыяд з 1871 па 1881 гг. праз камітэт прайшло шмат скарбаў старадаўніх манет, знойдзеных на тэрыторыі Віцебскай губерні. Аднак абсалютная большасць з іх у музеі не затрымалася. Таксама тут не захаваліся шматлікія (звыш 100 адзінак) клішэ прадметаў і малюнкаў археалагічных старажытнасцяў Віцебскай губерні, выяў забудовы Віцебска, яго манастыроў і цэркваў. Пры гэтым усе клішэ каштавалі Віцебскаму губернскаму камітэту дастаткова вялікіх па тых часах грошай – прыкладна 1500 руб [24, с. 12].

Такім чынам, узнікала неабходнасць фактычнага аднаўлення музея. З сярэдзіны 80-х гг. XIX ст. віцебская інтэлігенцыя пачала рабіць захады па ажыццяўленню гэтай мэты. Такая ініцыятыва знайшла таксама падтрымку ў віцебскага губернатара В.М. Далгарукава, які ў 1889 г. выдаў спецыяльную адозву да павятовых прадвадзіцеляў дваранства і супрацоўнікаў статыстычнага камітэта з заклікам аб’яднаць намаганні для аднаўлення і развіцця музея. Аднак, па звестках Б. Брэжгі, шырокай грамадскай падтрымкі гэта ініцыятыва не займела, і справа трымалася толькі



ПолесГУ

на актыўнасці некалькіх сяброў губернскага статыстычнага камітэта, у тым ліку ўзгаданага вышэй А.Семянтоўскага [2, с. 10-11].

У фондах Віцебскага абласнога краязнаўчага музея захавалася кніга для запісу прадметаў, якія паступалі ў музей пры Віцебскім губернскім статыстычным камітэце на працягу другой паловы XIX ст. У ёй названы 5 аддзелаў: гістарычны, археалагічны, нумізматычны, прыродазнаўчы, этнаграфічны. Згодна гэтай крыніцы, самае першае паступленне ў музей было зроблена ў 1868 г. і складалася з дзвюх цаглін: «адна, як быццам, з развалін першай у Віцебскай губерні Полацкай Пятніцкай царквы, а другая – з падземных частак Ніжняга Віцебскага замка» [25, арк. 1-2]. Гэтыя прадметы падараваў музею сакратар статыстычнага камітэта А. Семянтоўскі [20, арк. 20]. Але ў кнізе паступленняў па нейкіх прычынах не былі зафіксаваны ўзгаданы вышэй лепельскі скарб з 225 манет.

Наступны запіс адносіцца толькі да 1886 г., калі ў музей паступіла некалькі прадметаў: бізун для пакарання арыштантаў, нейкая каска, ножны ад шаблі і некаторыя іншыя. Яны былі ўзяты выконваючым абавязкі сакратара губернскага статыстычнага камітэта з мясцовага архіва старажытных актавых кніг. Ніякіх звестак аб тым, калі і з якой нагоды гэтыя рэчы паступілі ў той архіў не захавалася. Трэцяе паступленне ў гістарычны аддзел музея мела месца ў пачатку 90-х гг. XIX ст. Усяго ў ім налічвалася 51 адзінка захавання [25, арк. 1-2].

У 1870 г. у археалагічны аддзел паступіла косць маманта, і толькі ў 1890 г. гэты аддзел папоўніўся матэрыяламі Люцынскага могільніка, які раскопваў выдатны беларусазнавец Е.Р. Раманаў (1855 – 1922). У тым жа годзе некалькі прадметаў з раскопак могільніка пры вёсцы Ступаны Дзінабургскага павета перадаў музею мясцовы памешчык А.А. Крузэ [25, арк. 11].

Па трэцім, нумізматычным аддзеле музея, кніга запісу прадметаў фіксуе толькі паступленні, зробленыя ў 90-х гг. XIX ст. Сярод іх найбольшую каштоўнасць меў збор віцебскага калекцыянера В.П. Федаровіча (1848 – 1911) [25, арк. 21-24]. Аднак у кнізе не пазначаны паступленні канца 60-х гг. Так, неадменны сябра Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта Ф.П. Купчынскі ў першы год існавання музея перадаў яму калекцыю з 66 сярэбраных і медных рэдкіх медалёў і манет. Сярод іх 10 манет часоў Рэчы Паспалітай, шведскія, прускія, аўстрыйскія, расійскія і іншыя еўрапейскія манеты канца XVII, XVIII і пачатку XIX ст. [26, арк. 14].

У прыродазнаўчы аддзел экспанаты паступалі ў 1888, 1892 і 1893 гг. Тут знаходзілася калекцыя насякомых (38 асобнікаў), лекавыя травы з Рэжыцкага павета (20 асобнікаў), чучалы птушак (4 асобнікі) [25, арк. 31].

Нарэшце, этнаграфічны аддзел папаўняўся з 1888 па 1892 гг. Ад агента Віленскага земскага банка Шадурскага паступілі ўзоры матэрыі, якія выраблялі сяляне Рэжыцкага павета [25, арк. 41-45]. У 1891 г. Е.Р. Раманаў перадаў у Віцебскі губернскі статыстычны камітэт гэтак званую «Чорную кнігу» знахара Себежскага павета Е. Іванова [20, арк. 28].

Намаганні віцебскай інтэлігенцыі завяршыліся адкрыццём у пачатку 1894 г. «культурна-гістарычнага і прыродазнаўча-навуковага музея», які стаў даступным для публікі. Газета «Минский листок» падкрэслівала асаблівую заслугу сяброў Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта ў яго стварэнні. Яна таксама паведамляла аб сабраных у новым музеі друкаваных, рукапісных і мастацкіх помніках, цікавых для гісторыі Полацкага княства і старажытнага Віцебска. З другога боку, справядліва заўважалася, што шмат аддзелаў патрэбна яшчэ істотна папоўніць [27, с. 3].

На 1 студзеня 1894 г. у музеі пры Віцебскім губернскім статыстычным камітэце налічвалася 3814 прадметы: па аддзелу гістарычнаму – 53, археалагічнаму – 305, нумізматычнаму – 3261, прыроднаму – 69, этнаграфічнаму – 125 [2, с. 12]. Б. Брэжга зазначае, што цікавасць да музею ўзрастала з боку публікі. Аднак, зноў жа, з-за недахопу месца ў 1901 г. значная частка яго экспанатаў была перададзена Віцебскаму царкоўна-археалагічнаму музею. Усе астатнія матэрыялы з музея пры Віцебскім статыстычным камітэце ў 1913 г. былі перададзены ў Віцебскую навуковую архіўную камісію.

Асновы музея Мінскім губернскім статыстычным камітэце былі закладзены ў 1867 г., калі ў камітэт былі дастаўлены ўзоры мясцовых лясных парод разам з невялікімі арніталагічнай і мінералагічнай калекцыямі. Яны паступілі з Мінскага ўпраўлення дзяржаўнымі маёмасцямі, куды ў свой час былі ахвяраваны былым лясным рэвізорам Архірэевым. Пазней калекцыю мінералаў значна папоўніў мясцовы калекцыянер Шымкевіч. Акрамя таго, да гэтых матэрыялаў быў далучаны збор археалагічных прадметаў, паступіўшых ад археолага Г.Х. Татура (1846 – 1907) і мінскага краязнаўца Разнарэвіча. Значную падтрымку гэтаму музею аказалі мінскія губернатары У.М. Токараў і В.І. Чарыкаў [28].

ПолесГУ

Мінскі губернскі статыстычны камітэт браў удзел у Маскоўскай Антрапалагічнай выставе 1879г. і даслаў туды шэраг матэрыялаў для будучага Антрапалагічнага музея. Г. Татур сцвярджаў, што гэтыя ахвяраванні не пашкодзілі якасці калекцый музея пры статыстычным камітэце. У яго працягвалі паступаць разнастайныя прадметы з розных куткоў губерні. Нумізматычны збор быў перапоўнены дублетамі [29, арк. 146].

У музеі экспанаваліся саламяныя вырабы з мястэчка Лахва Мазырскага павета, якія «… вылучаліся лёгкасцю і вытанчанасцю работы». Гарбарныя вырабы паступілі з Рэчыцкага, Мінскага, Бабруйскага паветаў і мястэчка Брагін, а жалезныя – з Аляксандраўскага завода, які знаходзіўся ў Барысаўскім павеце. Таксама тут меліся разнастайная кераміка, посуд з зялёнага шкла (Пінскі павет), шмат мадэляў гаспадарчых прадметаў, зробленых з дрэва, узоры насення, прадуктаў харчавання, тканін, пражы [28].

Супрацоўнікі музея ўзялі на ўлік 14 тыс. курганоў на тэрыторыі Мінскай губерні. На 1880 г. тут знаходзілася звыш 600 археалагічных прадметаў, пераважна з раскопак мінскага калекцыянера Г.Х. Татура. Прафесар Кіеўскай духоўнай акадэміі М.І. Пятроў, які наведаў музей пры Мінскім губернскім статыстычным камітэце ў 1889 г., прыйшоў да высновы, што галоўная заслуга ў яго арганізацыі належала Татуру [30, с. 468].

Каштоўным набыткам музея былі сабраныя рэдактарам неафіцыйнай часткі «Минских губернских ведомостей» Р.Г. Ігнацьевым (1829 – 1886) багатыя зборы беларускага фальклору, прадметы побыту і калекцыя музычных народных інструментаў. Аднак з-за абмежаванасці экспазіцыйнай плошчы гэтыя і іншыя цікавыя музейныя калекцыі былі маладаступныя для наведвальнікаў [31, с. 47].

У 1880 г. працавала «Мінская прыватная выстава славутасцяў рознага роду». Сярод яе арганізатараў былі і супрацоўнікі музея пры статыстычным камітэце. Яна мела некалькі аддзелаў: мастацкі, антрапалагічны, этнаграфічны, збройны, бібліяграфічны. Галоўная задача выставы заключалася ў тым, каб як мага шырэй пазнаёміць мясцовую публіку з экспанатамі прыватных музейных збораў. Цікавыя археалагічныя знаходкі даслалі на яе граф Э.К. Гутэн-Чапскі (1828 – 1896) і Г.Х. Татур [32, с. 216-217]. Арганізатары адзначылі зацікаўленасць жыхароў Мінска і губерні да выставы, але ў будучым такія мерапрыемствы не праводзіліся.

Аднойчы музей пры губернскім статыстычным камітэце прыцягнуў увагу сталічных навукоўцаў. У ліпені 1886 г. яго наведаў супрацоўнік маскоўскага Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі К. Ікаў. Тут ён убачыў археалагічную калекцыю чарапоў з мясцовых курганоў. Яму падалося, што гэта калекцыя знаходзілася без запатрабавання. Праз некалькі месяцаў, у снежні 1886 г., на імя мінскага губернатара М.М. Трубяцкога з Масквы прыйшоў ліст, у якім паведамлялася, што ў Антрапалагічным музеі згаданага таварыства ёсць істотны прабел па краніялогіі Мінскай губерні і суседніх з ёй губерняў. Далей выказвалася пажаданне, каб калекцыя, якая знаходзілася пры губернскім статыстычным камітэце, была перададзена ў Маскву [33, арк. 1-2].

Супраць гэтага з рашучым пратэстам выступіў сябра камітэта Г.Х. Татур. У рапарце на імя мінскага губернатара ён падкрэсліў, што большасць прадметаў згаданай калекцыі была ім набыта за ўласныя сродкі. Камітэт жа ніякіх выдаткаў на гэтыя мэты не рабіў. Калекцыю ён размясціў у музеі камітэта па асабістай просьбе былога губернатара В.І. Чарыкава ў 1876 г. «для агульнай карысці, каб паставіць яе на пачэснае месца, даць наглядны штуршок для развіцця тут археалагічных ведаў, а ў асаблівасці – для дакладу мною аб археалагічных занятках па лініі губерні міністру ўнутраных спраў» [33, арк. 3]. Да таго ж, Г.Х. Татур змясціў сваю калекцыю ў камітэт часова, без ахвяравання. Такім чынам, права прыватнай уласнасці абараніла гэты збор ад вывазу.

У 1888 г. Мінскі губернскі статыстычны камітэт пасылаў у Маскоўскае археалагічнае таварыства са свайго музея адну з археалагічных калекцый для часовага экспанавання. Пасля вяртання высветлілася, што яна значна пашкоджана. Супрацоўнікі камітэта выказалі сваё шкадаванне з нагоды такога факту ў лісце, дасланым маскоўскім калегам [34, арк. 6].

Сабраныя ў музеі пры Мінскім губернскім статыстычным камітэце матэрыялы былі расфарміраваны ў канцы XIX – пачатку XX ст. Частка з іх патрапіла ў Віленскі музей пры публічнай бібліятэцы, у сталічныя Дашкаўскі і Рускі этнаграфічныя музеі. Астатнія калекцыі разам з гістарычнай бібліятэкай і рукапісамі ў 1909 г. былі перададзены ў музей Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта. Пры гэтым пэўная частка прадметаў была назаўсёды страчана [35, с. 6; 6, с. 87-88; 31, с. 45].



ПолесГУ

Музей пры Гродзенскім статыстычным камітэце таксама быў заснаваны ў 1867 г. [6, с. 110]. Праз 5 гадоў, у 1872 г., лепшыя калекцыі гэтага музея былі прадстаўлены на Політэхнічнай выставе ў Маскве [6, с. 88]. На жаль, ён у далейшым не атрымаў належнага развіцця. Адсутнасць сталых крыніц фінансавання прывяла да паступовага заняпаду музея. Як і ў Мінску, вельмі абясцэньвала працу яго стваральнікаў тая акалічнасць, што музейныя зборы былі недаступныя для публікі з-за недахопу экспазіцыйных плошчаў. Неабходна адзначыць, што статыстычны камітэт праводзіў збор інфармацыі аб помніках археалогіі на тэрыторыі Гродзенскай губерні і ў 70-х гг. XIX ст. Ажыццяўленне гэтай праграмы магло ўзбагаціць фонды яго музея. Аднак валасныя праўленні давалі пераважна кароткія адпіскі на запыты з губерні. Звычайна іх змест зводзіўся да таго, што археалагічных помнікаў у дадзенай воласці няма [36, арк. 1-152]. Музей пры Гродзенскім статыстычным камітэце фармальна праіснаваў да 1899 г., пасля чаго, у пачатку XX ст. яго экспанаты былі перададзены царкоўна-археалагічнаму музею [6, с. 88-89].

## ВЫВАДЫ

Такім чынам, у музеях пры губернскіх статыстычных камітэтах, створаных у Магілёве, Віцебску, Мінску і Гродна, збіраліся цікавыя матэрыялы, якія адлюстроўвалі разнастайныя аспекты краёвага жыцця. Фактычна яны сталі прататыпамі сучасных гісторыка-краязнаўчых музеяў. Аднак стваральнікі гэтых музеяў мелі абмежаваныя магчымасці арганізаваць іх працу паводле найлепшых дасягненняў музейнай практыкі таго часу

Праблемы, з якімі сутыкаліся ў працэсе сваёй дзейнасці музеі пры губернскіх статыстычных камітэтах, былі тыповымі і для іншых публічных музеяў Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. (царкоўна-археалагічных, музеяў пры навуковых і навучальных установах, земствах). Іх матэрыяльнае становішча было нестабільным і звычайна залежала ад фінансавых рэсурсаў тых або іншых дзяржаўных устаноў і царкоўных арганізацый, пры якіх яны ствараліся. Магчымасці самастойна зарабіць грошы ў музеяў былі даволі абмежаваныя, а таксама далёка не ўсе іх кіраўнікі жадалі гэтым займацца. Прыватныя ж ахвяраванні навукоўцаў-энтузіястаў для тых музеяў, якія яны засноўвалі, не маглі істотна выправіць сітуацыю.

У плане фарміравання фондаў музеяў можна вылучыць наступныя асноўныя рысы: вялікая частка экспанатаў збіралася па прамым распараджэнні кіраўніцтва тых або іншых дзяржаўных устаноў; своеасаблівымі праграмамі збору музейных экспанатаў часта выступалі розныя ведамасныя цыркуляры і інструкцыі; значныя праблемы ў збіральніцкай дзейнасці музеяў стваралі выпадковыя паступленні, калі немагчыма было вызначыць неабходныя пра іх звесткі; для сабраных матэрыялаў не заўсёды існавала прадуманая сістэма класіфікацыі, што прыводзіла да іх блытаніны і перыядычнага пераразмеркавання музейных рэчаў. Самы ж галоўны адмоўны арганізацыйны недахоп заключаўся ў тым, што для музеяў пры губернскіх статыстычных камітэтах не былі распрацаваны і афіцыйна зацверджаны нарматыўныя дакументы (статуты, палажэнні).

Пералічаныя фактары істотна перашкаджалі дынамічнаму развіццю музеяў пры губернскіх статыстычных камітэтах і не дазвалялі ім сфарміравацца ў паўнавартасныя публічныя музеі гісторыка-краязнаўчага профілю. Наведванне гэтых музеяў было магчымым толькі пры атрыманні спецыяльнага дазволу ад кіраўніцтва губернскіх статыстычных камітэтаў. Афіцыйна даступнымі для публікі сталі толькі музеі ў Віцебску і ў Магілёве адпаведна ў 1894 і 1898 гг.

Нягледзячы на ўсе адзначаныя праблемы ў развіцці музеяў пры губернскіх статыстычных камітэтах, асабліва падкрэслім, што іх супрацоўнікі закладвалі традыцыі практычнай дзейнасці публічных музеяў, якая была новай з'явай грамадскага жыцця ў Беларусі у другой палове XIX – пачатку XX ст., і зрабілі свой унёсак у фарміраванне новай спецыфічнай навуковай дысцыпліны – музеязнаўства.

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ


1. Каспяровіч, М. І. Краязнаўства. Нарысы / М. І. Каспяровіч. – Менск: Белдзяржвыд, 1929. – 159 с.
2. Breźgo, B. Muzeja Witebskie / B. Breźgo. – Warszawa, 1926. – 30 s.
3. Бандарчык, В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі. (Пачатак XX ст.) / В. К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1970. – 124 с.
4. Каханоўскі, Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.


Полесгу

5. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
6. Гужалоўскі, А. А. Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: Нац. архіў РБ, 2001. – 124 с.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 2005. – Воп. 1. – Спр. 42.
8. Протокол заседания Могилевского губернского статистического комитета 15 ноября 1867 г. // Могилевские губернские ведомости. – 1867. – 18 ноября. – С. 210.
9. Фурсов, М. Несколько слов о Могилевском музее. / М. Фурсов // Могилевские губернские ведомости. – 1890. – № 58. – С. 255 – 257.
10. НГАБ. – Фонд 2219. – Воп. 1. – Спр. 35.
11. Герасімовіч, У. А. Музей у этнічнай камунікацыйнай сістэме / У. А. Герасімовіч // Славянскія культуры: гістарычны вопыт і сучасныя праблемы. [Зб. арт.] / Акад. навук Беларусі, Інстытут мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск, 1996. – С. 100 – 108.
12. Опыт описания Могилевской губернии. В трех книгах, составлен по программе и под редакциею председателя могилевского губернского статистического комитета А. С. Дембовецкого. – Могилев-на-Днепре: Типография губернского правления, 1884. – Кн. 2. – 1000 с.
13. Фурсов, М. Описание Могилевского музея / М. Фурсов. – Могилев: Типография губернского правления, 1898. – 53 с.
14. Памятная книжка Могилевской губернии на 1893 г. – Могилев-на-Днепре: Типография губернского правления, 1893. – 441 с.
15. Отчет по Могилевскому статистическому комитету и состоящих при нем Публичной Библиотеке и Музею за 1898 г. – Могилев: Типография губернского правления, 1899. – 10 с.
16. Открытие Могилевского музея. // Могилевские губернские ведомости. – 1898. – 28 октября. – С. 343-344.
17. Обзор Могилевской губернии за 1898 гг. – Могилев: Могилевский губернский статистический комитет, 1899.
18. Обзор Могилевской губернии за 1902 гг. – Могилев: Могилевский губернский статистический комитет, 1903.
19. Обзор Могилевской губернии за 1911 гг. – Могилев: Могилевский губернский статистический комитет, 1912.
НГАБ. – Фонд 2502. – Воп. 1. – Спр. 156.
20. Краснянский, В. Краткий очерк музейного строительства в Витебске / В. Краснянский // Віцебскі сшытак. – 2000. – № 4. – С. 206-211.
21. Хмяльніцкая, Л. Гісторык з Віцебска (жыццяпіс Аляксея Сапунова) / Л. Хмяльніцкая. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2001. – 256 с.
22. НГАБ. – Фонд 2502. – Воп. 1. – Спр. 166.
23. Отчет о деятельности Витебского губернского статистического комитета за 1889 год. – Витебск: Губернская типография, 1890. – 68 с.
24. Віцебскі абласны краязнаўчы музей (ВАКМ). – Фонд 7. – Спр. 2.
25. НГАБ. – Фонд 2502. – Воп. 1. – Спр. 171.
26. Открытие в Витебске культурно-исторического и естественно-научного музея // Минский листок. – 1894. – 22 марта. – С. 3.
27. Игнатьев, Р. Г. Музей при Минском губернском статистическом комитете / Р. Г. Игнатьев // Минские губернские ведомости. – 1878. – 28 января. – С. 57-58; 4 февраля. – С. 74; 11 февраля. – С. 86 – 87; 18 февраля. – С. 101 – 102; 25 февраля. – С. 110; 4 марта. – С. 134; 11 марта. – С. 146; 18 марта. – С. 165; 1 апреля. – С. 192.
28. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Фонд 1284. – Воп. 241. – Спр. 107.
29. Петров, Н. Из путешествия в Северо-Западный край / Н. Петров // Киевская старина. Год восьмой. Т. XXIV – XXV. – Киев: Типография Г. Т. Корчак-Новицкого, 1889.
30. Алексеев, Л. В. Музейное дело в дореволюционной Белоруссии (по предварительным данным) / Л. В. Алексеев // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. – Гродна, 1990. – С. 44-47.
31. Минская частная выставка достопримечательностей разного рода // Минские губернские ведомости. – 1880. – 19 апреля. – С. 216-217.
32. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 40.
33. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 59.
34. Минская старина. Вып. 1 / Труды Минского церковного историко-археологического комитета. Под ред. Д. Скрынченко. – Минск: Типография С. А. Некрасова, 1909.
35. Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне (НГАБ у Гродне). – Фонд 14. – Воп. 1. – Спр. 73.

ПолесГУ

# MUSEUMS ATTACHED TO THE GUBERNIYA STATISTIC COMMITTEES IN BELARUS (THE SECOND HALF OF XIX – THE BEGINNING OF XX CC.)

*I. V. GREBENCHUK*

***Summary***

The article reveals basic landmarks of the museum history attached to guberniya statistic committees in Belarus during the second half of the XIX-th – the beginning of the XX-th centuries. The ways of museum funds formation are investigated; short personal characteristics organizers are given. The attempt is made to analyze in complex the reason of not allowing the museums attached to guberniya statistic committees to develop into public museums of full value, of local lore and history profile.

*Поступила в редакцию 29 мая 2009 г.*

ПолесГУ